Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: НОВАЕ Ў ДАСЛЕДАВАННІ І ВЫКЛАДАННІ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі*

**27 сакавіка 1999 года**

**Частка 1**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 1999

Смолянко В. В. Развитие высшей школы Белоруссии за годы советской власти. Мн., 1968.

6. Евдокименко Н. Л. Проблемы становления и развития высшей школы Белоруссии (на материалах государственных и общественно-политических организаций 1921—1932 г.). Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1993; Астрога В. Даследаванне новай і навейшай гісторыі замежных краін на Беларусі ў міжваенны перыяд. Аутарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 1996.

**А. Вялікі**

## АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ПРАЦЫ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ. 1921—1941 гг.

Першая палова 20-х гг. характарызуецца не толькі стварэннем шэрагу вышэйшых навучальных устаноў, але і разгортваннем навуковай працы ў ВНУ. Аналізуючы асноўныя накірункі працы і прыярытэты навуковых даследаванняў вучоных вышэйшай школы ў пазначаны час, мажліва вызначыць два этапы. На першым этапе (1921 — першая палова 30-х гг.) асноўным накірункам даследчай працы былі даследаванні ў галіне сельскай гаспадаркі. І гэта не выпадкова. У адзначаны перыяд рэспубліка ўяўляла сабой пераважна сельскагаспадарчы сектар гаспадаркі краіны. Так, у 1925—1926 гг. прадукцыя сельскай гаспадаркі склала 47,9% нацыянальнага дахода рэспублікі. Да таго ж правядзенне сацыялістычных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы, пераразмеркаванне памешчыцкай зямлі, перавод дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак у калектыўныя, сцягванне хутароў і г.д. патрабавалі ад сельскагаспадарчых ВНУ не толькі падрыхтоўкі спецыялістаў, але і правядзення навуковых даследаванняў у галіне глебазнаўства, аграхіміі, лесазнаўства, меліярацыі і г.д. Неабходна улічваць таксама і той факт, што на Беларусі не існавала вышэйшых тэхнічных устаноў. Таму становіцца зразумелым, што даследаванні ў галіне сельскай гаспадаркі набываюць прыярытэтнае значэнне. Вядучымі цэнтрамі такой працы становяцца Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках і Віцебскі ветэрынарны інстытут.

Вучоныя ВНУ актыўна ўключаліся ў правядзенне навукова-даследчай працы. Напрыклад, супрацоўнікі кафедры глебазнаўства, якую ўзначальваў вядомы вучоны А. Я. Афанасьеў, у 1925—1931 гг. правялі тэрытарыяльныя даследаванні ўсіх глеб Беларусі, а ў 1931 г. на падставе атрыманых звестак былі складзены папярэднія карты глеб, якія дэманстраваліся на Усебеларускай выстаўцы ў Мінску ў 1931 г. [1, с. 116].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

А. Я. Афанасьеў з'яўляўся буйнейшым вучоным у галіне даследавання глеб. Прызнаннем яго высокай навуковай вартасці з'явілася запрашэнне прыняць удзел у першым міжнародным кангрэсе глебаведаў у ЗША, дзе ён выступіў з дакладам «Класіфікацыйная праблема ў расейскім глебазнаўстве».

У наступныя гады вялося дэталёвае даследаванне генезіса і геаграфіі, хіміі і мікрабіялогіі глеб. У выніку праведзеных даследаванняў у БССР былі вывучаны віды і разнавіднасці глеб, распрацавана іх класіфікацыя, дадзена адзнака галоўным тыпам. Вучоныя ў другой палове 30-х гг. склалі 195 глебавых карт для калгасаў і саўгасаў рэспублікі агульнай плошчай 146 тыс. га, 192 аграглебавыя нарысы і г.д. [1, с. 133]. Не менш значныя даследаванні праводзіліся і іншымі кафедрамі і факультэтамі сельскагаспадарчай акадэміі.

З адкрыццем у Віцебску ветэрынарнага інстытута значных поспехаў дасягнула ветэрынарная навука. У інстытуце з пачатку яго існавання (1924 г.) і да Вялікай Айчыннай вайны працавалі такія вядомыя вучоныя, як акадэмікі АН БССР, прафесары С. Н. Вышалескі (эпізааталогія), Х. С. Гарагляд (ветсанэкспертыза); дактары навук, прафесары П. А. Шлітэр (фізіялогія), С. П. Смірэнскі (анатомія) і інш.

Кафедры інстытута праводзілі значную практычную працу па прафілактыцы і лячэнню жывелы. Клінікі ўсіх кафедр інстытута аказвалі значную дапамогу калгасам і саўгасам у лячэнні жывелы. Так, клініка хірургічнага аддзялення да пачатку вайны прыняла 27303 хворых жывел, зрабіла 7 тыс. аперацый. Тэрапеўтычная клініка прыняла 10360 жывел, правяла 29652 дыягнастыравання і г.д. [2, с. 172].

Прызнаннем дасягненняў вучоных вышэйшай сельскагаспадарчай навукі з'явілася тое, што на III Усебеларускім з'ездзе навуковых работнікаў Беларусі (люты 1929 г.) адзначалася, што найбольш значныя дасягненні ў галіне сельскагаспадарчай навукі мелі вучоныя сельскагаспадарчай акадэміі і ветэрынарнага інстытута [3, л. 106].

У другой палове 30-х гг. распачынаюцца навуковыя даследаванні ў галіне тэхнічных навук. Вядучай навуковай установай у развіцці даследаванняў у гэтым накірунку становіцца створаны ў 1933 г. Беларускі палітэхнічны інстытут. Шырокае разгортванне будаўнічых работ у БССР абумовіла правядзенне навукова-даследчай працы ў гэтым накірунку. Кафедра будаўнічых канструкцый БПІ займае вядучае месца як у падрыхтоўцы інжынераў-будаўнікоў, так і аказанні практычнай дапамогі будаўнічым, праектным арганізацыям.

Так, выкананая ў 1936 г. кандыдатам тэхнічных навук М. З. Шавельскім навуковая праца «Некаторыя пытанні тэорыі жалезабетона» адыграла станоўчую ролю ў падцверджанні правільнасці разлікаў жалезабетонных



канструкцый па разбуральным нагрузкам і атрымала высокія станоўчыя водгукі як навукоўцаў, так і інжынераў-практыкаў [4, с. 161].

Шырокамаштабныя даследаванні па хіміі шкла праводзіліся на кафедры тэхналогіі шкла, якую ўзначальваў М. А. Безбародаў. Аб'ектам навуковых даследаванняў супрацоўнікаў кафедры сталі пытанні стварэння новага складу электралампавага, тэхнічнага шкла. Па сутнасці, М. А. Безбародаў з'явіўся арганізатарам беларускай школы вучоных шкловедаў.

Значная навуковая праца праводзілася і на іншых кафедрах і факультэтах політэхнічнага інстытута.

Навукова-даследчая праца, якая праводзілася ў вышэйшых навучальных установах, з'яўлялася арганічнай часткай навуковых даследаванняў у рэспубліцы. Навуковыя адкрыцці і распрацоўкі вучоных ВНУ у асаблівасці ў галіне глебазнаўства, аграхіміі, лесазнаўства, ветэрынарыі і г.д. набылі шырокую вядомасць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі і аказалі станоўчы ўплыў на развіцце асобных галін навукі.

### Літаратура


1. Белорусская сельскохозяйственная академия. Краткий очерк истории и деятельности. Мн., 1990.
2. Ученые записки Витебского ветеринарного института. 1940. Т. 7.
3. НА РБ. ф. 4. Оп. 7. Д. 193.
4. БПИ: Сб. науч. тр. Мн., 1957.


Н. Н. Ганущенко

## ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПОЛИТИКА В ОБЛАСТИ ВЕЧЕРНЕГО ОБУЧЕНИЯ МОЛОДЕЖИ В БССР (1976—1990 гг.)

Вечернее и заочное обучение в системе общеобразовательной школы БССР на различных этапах истории играло хотя и неравнозначную, но постоянно значительную роль. Оно способствовало ликвидации неграмотности и малограмотности в республике, осуществлению всеобщего семилетнего и восьмилетнего образования молодежи. С середины 70-х гг. главной задачей этих учебных заведений стало содействие осуществлению всеобщего среднего образования молодежи. О важности этой задачи свидетельствовало наличие на производстве в это время большого числа молодых людей, уровень образования которых был ниже среднего. Так, на 1 июня 1973 г. в БССР из числа молодых рабочих в возрасте до 29 лет включительно не имели среднего образования: в промышленности — 130,6



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ